ГОМЕЛЬСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 400469580
16.01.2023 Кравцов А.Г.
дата подпись (фамилия, инициалы)

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Гомельскага абласнога
выканаўчага камітэта
16 студзеня 2023 г. № 19

ЗМЯНЕННІ
ў Статут дзяржаўнай установы адукацыі
«Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»,
зарэгістраванай ў Адзіным дзяржаўным рэгістры
юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў
за № 400469580

1. Абзац трэці пункта 15 пасля слоў «агульнай сярэдняй» дапоўніць словамі «,сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай».
2. Абзац шосты пункта 16 пасля слоў «агульнай сярэдняй» дапоўніць словамі «,сярэдняй спецыяльнай, прафесійна-тэхнічнай».
3. Пункт 20 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«20. Установа мае права ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даход, толькі ў тым выпадку, калі яна неабходная для статутных мэт, дзеля якіх Установа створана, і адпавядае гэтым мэтам. Нарматывы па ажыццяўленні дзейнасці, якая прыносіць даход, не ставяцца.».

4. Пункт 23 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«23. Інстытут можа ажыццяўляць павышэнне кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю, па наступных профілях адукацыі, напрамках адукацыі:

профіль адукацыі – «Педагогіка», напрамак адукацыі – «Адукацыя»;

профіль адукацыі – «Сацыяльныя навукі, журналістыка і інфармацыя», напрамкі адукацыі – «Сацыяльныя і паводніцкія навукі», «Журналістыка і інфармацыя»;

профіль адукацыі – «Бізнес, кіраванне і права», напрамак адукацыі – «Бізнес і кіраванне»;

профіль адукацыі – «Службы», напрамкі адукацыі – «Сфера паслуг», «Ахова працы»;

профіль адукацыі – «Прыродазнаўчыя навукі, матэматыка і статыстыка», напрамак адукацыі – «Статыстыка.».

Лімітавая колькасць навучэнцаў у вочнай (дзённай) форме атрымання адукацыі – 350 чалавек, у завочнай форме – 150 чалавек.».

5. Пункт 24 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«24. Установа ажыццяўляе перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па завочнай форме навучання, па наступнай спецыяльнасці і спецыялізацыі, уключанай у Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 011-2009 «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 2 чэрвеня 2009 г. № 36:

спецыяльнасць: 1-01 03 72 – «Дашкольная адукацыя»,

кірунак спецыяльнасці: «Педагогіка дзяцінства»

кваліфікацыя «Педагог».

Лімітавая колькасць навучэнцаў у завочнай форме – 300 чалавек.

З 1 студзеня 2023 года ўстанова ажыццяўляе перападрыхтоўку кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, па завочнай форме навучання, па наступнай спецыяльнасці і спецыялізацыі, уключанай у Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 011-2022 «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 сакавіка 2022 г. № 54:

спецыяльнасць: 9-09-0112-01 – «Дашкольная адукацыя».

Лімітавая колькасць навучэнцаў у завочнай форме – 300 чалавек.».

6. З пункта 18 словы «медыцынская дзейнасць;» і «дзейнасць па забеспячэнні бяспекі юрыдычных і фізічных асоб.» выключыць.

7. Пункт 42 дапоўніць часткай другой наступнага зместу:

«Кампетэнцыя Упаўнаважанага органа Установы:

забеспячэнне захаванасці і эфектыўнасці выкарыстання маёмасці, замацаванай за Установай;

сумесна з Установай ажыццяўленне аналізу ўчынення і выканання здзелак па распараджэнні маёмасцю, замацаванай за Установай;

прыняцце рашэнняў аб поўным выкананні пакупніком маёмасці абавязкаў па здзелках па распараджэнні маёмасцю, замацаванай за Установай;

ажыццяўленне другіх паўнамоцтваў у адпаведнасці з заканадаўствам.».

8. Пункт 49 выключыць.

9. Пункт 50 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«50. Сродкі, атрыманыя Установай ад дзейнасці, якая прыносіць даходы і набытую за іх рахунак маёмасць, паступаюць у аператыўнае кіраванне Установы, улічваюцца на асобным балансе, калі другое не прадугледжана дзеючым заканадаўствам, і распараджэнне імі праводзіцца ў адпаведнасці з заканадаўствам і сапраўдным Статутам.».